www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

15 чэрвеня 2006 года, № 12 (1942)

ГОСЦІ

ВІТАЕМ ПОЛЬСКІХ БЕЛАРУСАФІЛАЎ!

Польскія старшакласнікі — лаўрэаты XII штогадовай алімпіяды па беларускай мове, якая праходзіць у Польшчы, былі гасцямі БДУ.

У групу ўвайшлі 27 школьнікаў і 5 членаў Галоўнага камітэта алімпіяды — выкладчыкі кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і ліцэяў польскіх гарадоў Бела-Падляска і Гайнаўка. Сярод польскіх гасцей быў і адзін з першых ганаровых дактароў БДУ, вядомы навуковец, прафесар Варшаўскага універсітэта Аляксандр Баршчэўскі.

Госці наведалі філалагічны факультэт, дзе сустрэліся з яго кіраўніцтвам, выкладчыкамі і студэнтамі, а таксама пераможцамі алімпіяд па беларускай мове ў нашай краіне. У гэты ж дзень адбылася сустрэча польскай дэлегацыі з кіраўніцтвам Белдзяржуніверсітэта з удзелам прадстаўнікоў ЮНЕСКА і Міністэрства замежных спраў Беларусі. Сярод іншых абмяркоўваліся пытанні магчымага далейшага навучання польскіх школьнікаў у нашым універсітэце, перспектывы супрацоўніцтва паміж БДУ і Варшаўскім універсітэтам.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ
Фота Аляксандра СНАПКА

ВЕДАЙ НАШЫХ!

"ПАЭМА ВЕРЫ" ПАКАРЫЛА МАСКВУ

Першае месца на маладзёжным конкурсе відэафільмаў "Славянскае юнацтва: мары і надзеі" ў Маскве ў намінацыі "Дакументальны фільм" заняла беларуская стужка "Паэма веры", знятая студэнтамі-чацвертакурснікамі факультэта журналістыкі БДУ Андрэем Куцілам і Аляксандрам Налівайкам на відэастудыі "SVS" студэнцкага гарадка БДУ.

Сваю работу аўтары прысвяцілі жыццю і творчасці філосафа, паэта і музыканта інака Мікалая (Алег Бембель), сына народнага мастака Беларусі Андрэя Бембеля.

Чацвёрты міжнародны конкурс "Славянскае юнацтва: мары і надзеі" праводзіцца ў межах расійскага праекта "Славянскія культуры на скрыжаванні тысячагоддзяў". Галоўным ініцыятарам конкурсу выступіла Дзяржаўная акадэмія славянскай культуры пры падтрымцы Маскоўскай Патрыярхіі і ўрада Масквы. Мерапрыемства адбылося ў рамках святкавання ў Маскве Дзён славянскага пісьменства і культуры.

Асноўныя мэты конкурсу — развіццё і ўмацаванне культурных зносінаў і творчых кантактаў паміж сучаснай моладдзю славянскіх краінаў, а таксама фарміраванне новага вобразу свету, у якім вызначальнымі будуць духоўныя, маральныя і эстэтычныя каштоўнасці.

Сняжана ЛІСОЎСКАЯ
Фота аўтара

СЕМІНАРЫ

АЛМАЗЫ ШТУЧНЫЯ — КАРЫСЦЬ САПРАЎДНАЯ

Міжнародны навукова-практычны семінар "Прымяненне сінтэтычных алмазаў у ювелірнай вытворчасці і спосабы іх ідэнтыфікацыі" адбыўся ў БДУ на пачатку чэрвеня.

Мерапрыемства адбылося з ініцыятывы УП "Адамас БДУ", БДУ і Міністэрства адукацыі Беларусі. Удзел у ім прынялі супрацоўнікі і спецыялісты кампаній, якія гандлююць алмазамі ці ўжываюць іх у вытворчасці, прадпрыемстваў прыборабудавання, ювелірных заводаў і фірмаў з Расіі, Украіны, Польшчы, Латвіі, Чэхіі. Беларускі бок быў прадстаўлены таксама супрацоўнікамі Савета міністраў, міністэрстваў замежных спраў, абароны, фінансаў, адукацыі, Дзяржаўнага мытнага камітэта, Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях. Запрашэнне на выставу атрымалі прадстаўнікі дыпламатычных місій Расіі, Польшчы, Арменіі, Ізраіля і Кітая, акрэдытаваных у нашай краіне.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВІНШУЕМ!

УЗНАГАРОДЖАНЫЯ ЗА ПЕРАМОГУ

Першае месца на традыцыйнай універсітэцкай віктарыне, прысвечанай Дню Перамогі, сёлета занялі першакурснік Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ Пётр Саянкоў і выпускніца ліцэя БДУ Вераніка Клачок.

Другое месца падзялілі між сабой пяцікурснік геаграфічнага факультэта Аляксей Глушцоў і першакурсніца юрыдычнага каледжа БДУ Таццяна Пашкевіч. На трэцім месцы апынуліся першакурснік фізічнага факультэта Дзмітрый Ушакоў і выпускніцы ліцэя БДУ Аэла Шабунеўская і Наталля Ягела.

Віктарына адбываецца ва універсітэце штогод з 2003 г. Сёлета адказы ўдзельнікаў на 14 пытанняў па гісторыі і літаратуры пра Вялікую Айчынную вайну ацэньвала журы пад кіраўніцтвам прарэктара БДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзіміра Суворава.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

СУПРАЦОЎНІЦТВА

БДУ — ЧАНЧУНЬ: СУВЯЗІ МАЦНЕЮЦЬ

Дагавор пра акадэмічнае супрацоўніцтва паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Чанчуньскім інстытутам міжнароднай камерцыі быў падпісаны 5 чэрвеня ў будынку Мінскай ратушы прарэктарам па вучэбнай рабоце БДУ Уладзімірам Клюнем і рэктарам кітайскага інстытута Лі Чанам. У рамках дакумента прадугледжваюцца абмен навучальна-метадычнымі дапаможнікамі і навучальнымі праграмамі, стажыроўкі і камандзіроўкі выкладчыкаў, арганізацыя моўных практык (рускай і кітайскай мовы), курсаў кітайскай і рускай моваў, абмен групамі навукоўцаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, правядзенне сумесных спартыўных спаборніцтваў, студэнцкіх форумаў і канферэнцый.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ
Фота Аляксандра СНАПКА

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

БДУ АДКРЫТЫ ДЛЯ ЎСЯГО СВЕТУ
Міжнародная дзейнасць універсітэта
Стар. 2

НЕСТАНДАРТНЫ МАТЭМАТЫК СУПРУН
Інтэрв'ю з найлепшым вынаходнікам Беларусі
Стар. 3

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом КНР у Беларусі У Хуньбінем. Былі абмеркаваны пытанні, звязаныя са стварэннем на базе Белдзяржуніверсітэта Інстытута імя Канфуцыя і павелічэннем колькасці кітайскіх студэнтаў у нашай ВНУ.

Рэктар БДУ прафесар В. Стражаў прыняў удзел у рабоце VIII з'езда рэктараў вышэйшых навучальных установаў Расіі, які прайшоў у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце з удзелам прэзідэнта РФ У.Пуціна. В. Стражаў выступіў на пленарным пасяджэнні з'езда з аналізам развіцця вышэйшай адукацыі ў СНД, засяродзіўшы ўвагу на працэсах, якія адбываюцца ў гэтай сферы ў Расіі, а таксама азнаёміў з сучасным станам беларускай вышэйшай школы.

Першы прарэктар БДУ прафесар Сяргей Рахманаў прыняў удзел у рабоце міжнароднага сімпозіума "Фатаграфія ў XXI стагоддзі: традыцыйныя і лічбавыя працэсы", які адбыўся ў Санкт-Пецярбургу. С.Рахманаў выступіў на сімпозіуме з дакладам па даследаванні нанаструктур і нанатэхналогій у БДУ.

Дагавор пра супрацоўніцтва падпісаны паміж евангелічна-тэалагічным факультэтам універсітэта імя Эберхарда Карла горада Цюбінгем (Германія) і нашым універсітэтам. Дакументам прадугледжваецца абмен студэнтамі, правядзенне сумесных семінараў і канферэнцый. З нямецкага боку дагавор падпісаў дэкан евангелічна-тэалагічнага факультэта прафесар Айлерт Хермс, з беларускага — прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ прафесар Уладзімір Клюня, а таксама першы прарэктар Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ айцец Серафім.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ

Пасяджэнне Вучонага савета БДУ на тэму "Міжнароднае супрацоўніцтва і міжнародныя сувязі БДУ" адбудзецца 26 чэрвеня. Пачатак мерапрыемства ў 10.15 у зале пасяджэнняў Вучонага савета.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

БДУ АДКРЫТЫ ДЛЯ ЎСЯГО СВЕТУ

Адной з самых важных задач любой ВНУ з'яўляецца ўмацаванне прэстыжу не толькі ў сваёй краіне, але і за яе межамі. У БДУ як вядучай вышэйшай навучальнай установе рэспублікі шмат робіцца для інтэграцыі ў сусветную адукацыйную і навуковую прастору, а таксама для таго каб дыпломы нашага універсітэта прызнаваліся ва ўсім свеце.

Пра міжнародную дзейнасць універсітэта расказвае Уладзімір Юр'евіч ЦІХАНАЎ, начальнік упраўлення міжнародных сувязей БДУ:

МІЖНАРОДНАЕ МІЖВУЗАЎСКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Развіццё эфектыўных узаемавыгадных партнёрскіх сувязей з вядучымі сусветнымі універсітэцкімі цэнтрамі з'яўляецца стратэгічнай задачай усёй міжнароднай дзейнасці БДУ.

Белдзяржуніверсітэт — адзін з арганізатараў Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў і універсітэт-каардынатар ад Рэспублікі Беларусь ва універсітэцкай сетцы Цэнтральнай Еўрапейскай ініцыятывы, удзельнік Міжнароднай універсітэцкай асацыяцыі, а таксама ініцыятар і кіраўнік сеткі класічных універсітэтаў у нашай рэспубліцы.

На базе універсітэта функцыянуе шэраг цэнтраў, звязаных з міжнароднай дзейнасцю: Цэнтр міжнародных даследаванняў БДУ, Рэспубліканскі Цэнтр кітаязнаўства «Іерогліф».

Геаграфічная структура замежных навучэнцаў у БДУ



68 % – Азія
19 % – Блізкі Усход і Афрыка
5 % – Краіны СНД і Балты
3 % – Заходняя Еўропа
3 % – Цэнтральная Еўропа
2 % – Паўночная і Лацінская Амерыка

Міжнароднае міжвузаўскае супрацоўніцтва ажыццяўляецца на аснове міжнародных дагавораў, падпісаных кіраўніцтвам універсітэта. Сёння БДУ паспяхова супрацоўнічае з больш чым 100 замежнымі ВНУ. Развіваюцца акадэмічныя абмены студэнтамі, выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі, адбываюцца сумесныя навукова-адукацыйныя мерапрыемствы і навуковыя даследаванні, рэалізуюцца міжнародныя праекты ў галіне арганізацыі навучальнага працэсу і універсітэцкага кіравання. Традыцыйна найбольш шчыльнае супрацоўніцтва — з Расійскай Федэрацыяй, краінамі Заходняй, Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы. Уключанае навучанне ва універсітэце ў межах такіх міжнародных пагадненняў праходзяць студэнты з Рурскага універсітэта (Бохум, Германія), Універсітэта імя Ф. Шылера (Йена, Германія), Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай (Люблін, Польшча), Лодзінскага універсітэта (Лодзь, Польшча), Карлава універсітэта (Прага, Чэхія) і многіх іншых. У той жа час нашы студэнты маюць магчымасць прайсці стажыроўку ў ВНУ — партнёрах БДУ. Такія сувязі з універсітэтамі Блізкага Усходу, Паўночнай Афрыкі і Азіяцкага рэгіёну дазваляюць развіваць акадэмічныя абмены студэнтамі-ўсходазнаўцамі, якія вывучаюць арабскую, кітайскую і японскую мовы, — Кітайскі універсітэт міжнародных адносін (Пекін, КНР), Універсітэт Васеда (Токіо, Японія), Каірскі універсітэт (Каір, Егіпет).

АКАДЭМІЧНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ НАВУКОВА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ І НАВУЧЭНЦАЎ БДУ

Рэальным індыкатарам уключанасці універсітэта ў сусветную навукова-адукацыйную прастору з'яўляецца ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў БДУ ў навуковых і метадычных канферэнцыях, сімпозіумах і семінарах, якія праводзяцца за мяжой. Штогод каля 1000 супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў БДУ едуць у замежныя камандзіроўкі для правядзення сумесных навуковых даследаванняў, чытання лекцый, удзелу ў канферэнцыях, алімпіядах і праходжання стажыроўкі ў рамках міжнародных адукацыйных праграмаў. Штогадовы рост колькасці замежных паездак супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта адлюстроўвае працэс паступовай інтэграцыі навукі і адукацыі БДУ ў агульнасусветны кантэкст.

АДУКАЦЫЯ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ

Адным з найважнейшых паказчыкаў якасці і эфектыўнасці адукацыйнай дзейнасці ВНУ, які сведчыць аб прэстыжы навучальнай установы на нацыянальным і міжнародным узроўнях, з'яўляецца наяўнасць замежных студэнтаў. За апошнія 5 гадоў колькасць замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ, павялічылася больш чым у 1,5 раза.

Навучанне замежных студэнтаў на кантрактнай аснове — адна з найважнейшых крыніц атрымання пазабюджэтных сродкаў, а таму прасоўванне БДУ на сусветным рынку адукацыйных паслуг з'яўляецца стратэгічнай задачай усёй міжнароднай дзейнасці універсітэта. Гэта асабліва важна для нашай краіны з улікам рэальнай ацэнкі магчымасцяў дзяржаўнага фінансавання адукацыі і ўлічваючы, што ў 2006—2008 гадах чакаецца дэмаграфічны правал: колькасць выпускнікоў школаў будзе ледзь адпавядаць колькасці месцаў для паступлення ў ВНУ. У цяперашні час на міжнароднай арэне вядзецца вострая канкурэнтная барацьба сярод універсітэтаў за замежных навучэнцаў. Каб перамагчы ў гэтай барацьбе, неабходна ствараць камфортныя ўмовы для прыцягнення замежных студэнтаў, весці актыўную рэкламную работу за мяжой.

Каб павысіць эфектыўнасць гэтага кірунку, у верасні 2005 г. у структуры ўпраўлення міжнародных сувязей быў створаны сектар маркетынгу адукацыйных паслуг для замежных грамадзян, які праводзіць аналіз сусветнага рынку адукацыйных паслуг, а таксама займаецца попытам і наборам замежных студэнтаў. Так, напрыклад, у выніку падпісанага ў лютым 2005 г. дагавора паміж БДУ і універсітэтам г.Х'юэ (В'етнам) БДУ плануе прыняць на кантрактнай аснове каля 30 студэнтаў для навучання па асноўнай 5-гадовай праграме і ў аспірантуры. БДУ выступіў ініцыятарам падпісання міжурадавага мемарандума паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і ўрадам штата Баелса Федэратыўнай Рэспублікі Нігерыя, у рамках якога падпісаныя пагадненні па навучанні нігерыйскіх грамадзян у вядучых ВНУ Беларусі, у тым ліку і ў Белдзяржуніверсітэце.

Сёння ва універсітэце па праграмах дауніверсітэцкага, асноўнага і паслядыпломнага цыклаў навучаюцца грамадзяне з больш чым 70 краінаў.

Паводле інфармацыі Галоўнага ўпраўлення навукі, па стане на 31 снежня 2005 г. у БДУ былі дагаворы і пагадненні пра супрацоўніцтва ў галіне навукі і адукацыі з 135 замежнымі адукацыйнымі і навукова-даследчымі ўстановамі, арганізацыямі з 32 краін і 2 еўрапейскіх арганізацый. Асабліва плённым было навуковае супрацоўніцтва з ВНУ і навуковымі арганізацыямі Расіі (23 сумесныя праекты), Германіі (21 сумесны праект), Польшчы (15 сумесных праектаў), Украіны (10 сумесных праектаў), Францыі (4 сумесныя праекты).

Падраздзяленні БДУ, а таксама асобныя навуковыя супрацоўнікі прымалі ўдзел у выкананні 63 праектаў міжнародных праграм, фондаў, грантаў, сярод якіх INTAS, CERN, BMBF, TEMPUS, а таксама праграмы Саюзнай дзяржавы, ААН, Еўрапейскага Саюза, NATO "Навука дзеля міру".

У 2005 г. працягваліся пастаўкі навукова-тэхнічнай прадукцыі БДУ на замежныя рынкі: было выканана 60 кантрактаў і дагавораў з даследчыцкімі цэнтрамі, інстытутамі, фірмамі і кампаніямі з 13 краін свету. Найбольшым попытам карысталіся навуковыя прылады, абсталяванне, новыя рэчывы і матэрыялы, штучныя алмазы, праграмныя прадукты, распрацоўка новых тэхналогій, апаратных і праграмна-апаратных сродкаў і інш.

Найбольш папулярнымі для замежных грамадзян з'яўляюцца факультэты эканамічны, філалагічны і міжнародных адносінаў, а таксама журналістыкі і біялагічны.

МІЖНАРОДНЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПРАГРАМЫ І ФОНДЫ

Сусветная практыка паказвае, што разнастайныя формы і віды акадэмічных абменаў — неабходная ўмова паспяховай і якаснай практычнай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Важную функцыю ў сучаснай навукова-адукацыйнай сферы выконваюць міжнародныя дабрачынныя фонды, якія дазваляюць студэнтам розных краінаў праходзіць навучанне за мяжой. Замежныя універсітэты амаль не выдзяляюць уласных сродкаў для навучання студэнтаў або аспірантаў па абмене. У такіх выпадках фінансаванне навучання адбываецца за кошт нацыянальных і міжнародных фондаў. Галоўным патрабаваннем для ўдзелу ў міжнароднай адукацыйнай праграме з'яўляецца валоданне замежнай мовай, а для навуковай стажыроўкі — наяўнасць публікацый, навуковых кантактаў і рэкамендацый прафесараў адной або некалькіх ВНУ.

Міжнародныя дагаворы БДУ па рэгіёнах свету



27 % – Заходняя Еўропа
23 % – Цэнтральная Еўропа
18 % – Краіны СНД
17 % – Азія
6 % – Паўночная і Лацінская Амерыка
5 % – Блізкі Усход і Паўночная Афрыка
4 % – Сярэдняя Азія

ПРАЕКТЫ МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА БДУ

У сакавіку 2006 г. у межах праекту TEMPUS "Пераўтварэнне навучальнага працэсу ў БДУ на аснове ECTS-сумяшчальных тэхналогій", які рэалізуецца нашым універсітэтам разам з ВНУ Германіі, Італіі і Іспаніі, адбылася азнаямляльная паездка студэнтаў і выкладчыкаў БДУ ва універсітэт Трэнта (Італія). Гэты TEMPUS-праект накіраваны на аптымізацыю навучальнага працэсу ў БДУ праз укараненне сістэмы адукацыйных заліковых адзінак, адпаведных еўрапейскай сістэме адзінак, што будзе спрыяць павышэнню статусу беларускай вышэйшай школы ў міжнароднай адукацыйнай прасторы.

БДУ актыўна супрацоўнічае і з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Кітайскай Народнай Рэспублікі. На сённяшні дзень падпісана 19 пагадненняў і дагавораў пра міжнароднае супрацоўніцтва з навуковымі і адукацыйнымі ўстановамі з 8 правінцый і 2 гарадоў цэнтральнага падпарадкавання Кітая. Сярод кітайскіх ВНУ — партнёраў Белдзяржуніверсітэта можна вылучыць такія буйныя навукова-адукацыйныя ўстановы, як Кітайскі універсітэт міжнародных адносін, Кітайскі палітыка-юрыдычны універсітэт, Харбінскі універсітэт навукі і тэхналогій, Чжэнь-Чжоўскі, Шанхайскі, Пекінскі універсітэты і многія іншыя.

Падрыхтавала Сняжана ЛІСОЎСКАЯ

АКЦЫІ

НА РАДАСЦЬ ДЗЕЦЯМ

Актывісты БДУ (з ГА "БРСМ" і Студэнцкага Саюза) адсвяткавалі Міжнародны дзень абароны дзяцей разам з выхаванцамі ясляў-садкоў № 329 і 402. Акцыю "Радасць дзецям", у рамках якой студэнты БДУ выязджаюць у дзіцячыя садкі, дзіцячыя дамы, ужо не першы год ладзіць ГА "БРСМ" БДУ.

У кожным садку студэнты правялі па два выступы — для дзяцей ад 1,5 да 3 гадоў і для дзяцей 3—5 гадоў. Для выступаў самі пісалі сцэнарыі, універсітэт дапамог з транспартам, арганізацыя БРСМ — з падарункамі.

Хіба радасць у дзіцячых вачах, дзіцячыя ўсмешкі — не самы лепшы падарунак для дарослых?

Дар'я ПРЫШЧЭПАВА

ВАКАЦЫІ

ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА — 2006

Дванаццаць студэнцкіх атрадаў, сфармаваных у БДУ, пачнуць сваю працу з 1 ліпеня.

500 юнакоў і дзяўчат зоймуцца добраўпарадкаваннем і падрыхтоўкай да новага навучальнага года студэнцкіх інтэрнатаў, тэрыторыі спорткомплексу на вул. Кастрычніцкай і тэрыторыі САК "Брыганціна", карпусоў базы "Заходняя Бярэзіна" (Валожынскі раён). Таксама іх чакае праца выхавальнікаў у "Брыганціне" і работа ў грамадскай прыёмнай камісіі. Акрамя таго, студэнтаў БДУ можна будзе ўбачыць на будаўніцтве гатэля "Еўропа", на добраўпарадкаванні Кургана Славы. Яны будуць дапамагаць ветэранам Вялікай Айчыннай, дзіцячым садкам Маскоўскага раёна сталіцы, ладзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы ў вайсковых часцях, дзіцячых садках, дзіцячых дамах, працаваць у РУП "Шчамысліца" (Мінскі раён).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

«ДЗЕСЯТКА» ПЕРАМАГЛА

Напрыканцы мая адбылося падвядзенне вынікаў Спартакіяды студгарадка БДУ.

Студэнты дзевяці універсітэцкіх інтэрнатаў вызначылі самага моцнага ў такіх відах спорту, як настольны тэніс, шахматы, міні-футбол, перацягванне каната, баскетбол, спартыўнае арыентаванне, плаванне, гіравы спорт і більярд.

Уладальнікам самага галоўнага трафея, Кубка Спартакіяды студгарадка, у гэтым навучальным годзе стаў інтэрнат №10. Другое агульнакаманднае месца атрымаў інтэрнат №6, на трэцім апынуўся інтэрнат № 7.

Кацярына БУЛАЦЕЦКАЯ

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

РЫХТАВАЦЬ ДЫЗАЙНЕРАЎ ПА-НОВАМУ

Кафедра дызайну гуманітарнага факультэта БДУ прымае ўдзел у IV спецыялізаванай выставе-кірмашы "Дызайн-біржа — 2006" (13—16 чэрвеня, НВЦ "Белэкспа"), дзе сёлета прадставіла візуальны матэрыял, які дэманструе асаблівасці методыкі прафесійнай падрыхтоўкі маладых дызайнераў. У структуры экспазіцыйных матэрыялаў быў паказаны відэаролік, які адлюстроўвае арганізацыю асяроддзя навучання ў майстэрнях, а таксама дыпломныя работы выпускнікоў апошніх гадоў. Выстава суправаджалася інфармацыйнай лістоўкай і прэзентацыяй кнігі дацэнта Алега Чарнышова "Дызайн-адукацыя: новая мадэль прафесійнай падрыхтоўкі дызайнераў".

Педагогі кафедры дызайну гуманітарнага факультэта БДУ таксама прынялі актыўны ўдзел у рабоце круглага стала на тэму "Беларусь у дызайне XXI стагоддзя".

Іван ФЕДАРОВІЧ

ПЕРШЫЯ ТРАДЫЦЫІ МАЛАДОГА ФАКУЛЬТЭТА

Напрыканцы мая гуманітарны факультэт з ініцыятывы студэнцкага актыву наладзіў мерапрыемства пад лозунгам "За здаровы лад жыцця". Надвор'е ледзь не сапсавала ўсё свята: дождж не спрыяў выезду на Пціч. Аднак каманда дэканата, у адрозненне ад нешматлікіх студэнтаў, прыбыла на спаборніцтвы ў поўным складзе. На гэтым сюрпрызы кіраўніцтва факультэта не скончыліся: старэйшае пакаленне выявіла такую волю да перамогі, што ў выніку спаборніцтвы скончыліся нічыёй.

Новае свята, як спадзяюцца арганізатары, стане адной з першых традыцый маладога факультэта.

Іван ФЕДАРОВІЧ

АСОБЫ

НЕСТАНДАРТНЫ МАТЭМАТЫК СУПРУН

Дацэнт нашага універсітэта, кандыдат тэхнічных навук Валерый Супрун прызнаны найлепшым вынаходцам Беларусі 2006 г. Гэтым званнем узнагародзіла яго Сусветная арганізацыя інтэлектуальнай уласнасці. Падчас міжнароднай канферэнцыі "Актуальныя пытанні адукацыі ў сферы інтэлектуальнай уласнасці" напрыканцы мая ён атрымаў медаль і дыплом.

Валерый Паўлавіч мае на сваім рахунку 167 вынаходніцтваў у галіне вылічальнай тэхнікі і электронікі, многія з якіх укаранёныя ў адукацыйны працэс. Выкарыстоўваючы найноўшыя арыгінальныя методыкі, ён вучыць студэнтаў праектаваць і сінтэзаваць такія прылады, як дваічныя суматары, памнажальнікі, шматфункцыянальныя і універсальныя лагічныя модулі. Дарэчы, студэнты і аспіранты з яўляюцца сааўтарамі каля 40 вынаходстваў навукоўца.

З нашым універсітэтам В. Супрун звязаны ад студэнцкіх гадоў: у 1971 г. ён скончыў матэматычны факультэт, потым працаваў старшым навуковым супрацоўнікам вылічальнага цэнтра БДУ.

У 1980 г. ён абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці "Элементы і прылады вылічальнай тэхнікі і сістэм кіравання".

З 1996 г. Валерый Паўлавіч — намеснік дэкана па навуковай рабоце механіка-матэматычнага факультэта, дацэнт кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі.

— Чаму менавіта вас Сусветная арганізацыя інтэлектуальнай уласнасці прызнала вынаходцам года ў Беларусі?

— У нашай краіне вельмі шмат вынаходцаў. Напэўна, у тым, што выбар быў зроблены на маю карысць, вырашальную ролю адыграў той факт, што ў нашым універсітэце вынікі вынаходніцкай дзейнасці найбольш актыўна ўкараняюцца ў адукацыйны працэс.

— Што вы адчувалі, калі даведаліся пра такую ўзнагароду?

— Для мяне гэтае прызнанне з'яўляецца вялікім поспехам у маёй навукова-педагагічнай дзейнасці. Таксама гэта поспех механіка-матэматычнага факультэта і ўсяго Белдзяржуніверсітэта. Для БДУ гэты поспех нельга назваць выпадковым: наш універсітэт мае магутны навуковы патэнцыял і багатыя традыцыі ў галіне вынаходніцкай дзейнасці.

Што датычыць поспеху мехмата, дык гэта для ўсіх вялікая нечаканасць: лічыцца, што матэматыкі толькі і ўмеюць, што даказваць тэарэмы і рашаць тэарэтычныя задачы. І ўвогуле, што можна вынайсці ў матэматыцы? Адказаць на гэтае пытанне вельмі лёгка: у нас на факультэце ёсць аддзяленне матэматычнай электронікі, дзе студэнтам чытаюць курсы па вышэйшай матэматыцы і вылічальнай тэхніцы. Студэнты вучацца праектаваць прылады вылічальнай тэхнікі, выкарыстоўваючы глыбокія веды вышэйшай матэматыкі. Таму студэнты і аспіранты факультэта з'яўляюцца сааўтарамі каля 40 вынаходстваў.

— Як вы, матэматык, сталі вынаходцам? Ці можна навучыцца стаць вынаходцам?

— Класік сказаў, што матэматыка розум у парадак прыводзіць. Школьнік, які сур'ёзна займаецца матэматыкай, развівае сваё мысленне. Але побач са "школьнай матэматыкай" існуе і "нестандартная матэматыка", якая ўключае ў сябе метады, якія не вывучаюцца ў школе. Веданне нестандартнай матэматыкі развівае арыгінальнае, нестандартнае мысленне, што можна з поспехам выкарыстоўваць у розных сферах чалавечае дзейнасці, у тым ліку і ў вылічальнай тэхніцы. Пазнаёміцца з нестандартнымі метадамі рашэння задач па матэматыцы можна, напрыклад, у маёй кнізе з аднайменнай назвай.

— Як можна было б заахвоціць удзел студэнтаў і аспірантаў у патэнтна-вынаходніцкай дзейнасці?

— Па-першае, у навучальныя планы ВНУ Беларусі трэба ўвесці дысцыпліны, звязаныя з аўтарскім правам, патэнтным правам, аховай аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Па-другое, афіцыйны бюлетэнь вынаходстваў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці павінен быць уключаны ў пералік тых выданняў, якія ВАК улічвае пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Матэрыял падрыхтавала Валянціна КЛЯНІЦКАЯ

Ад рэдакцыі: інтэрв'ю з вучнем В. Супруна, студэнтам V курса мехмата Данілам Гарадзецкім чытайце на сайце газеты **www.gazeta.bsu.by**

ЮБІЛЕІ

З ЛЮБОЎЮ ДА НАВУКІ

5 чэрвеня свой юбілей адсвяткавала выдатны навуковец-палінолаг, доктар геаграфічных навук і загадчыца кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі на геаграфічным факультэце БДУ Ядвіга Казіміраўна Яловічава.

Пад уплывам В.П. Якушка Ядвіга Казіміраўна зацікавілася вывучэннем азёраў — лімналогіяй. У аспірантуры пад кіраўніцтвам акадэміка Г.І. Гарэцкага стала вывучаць паліналогію — навуку пра пылок і споры раслін з адкладаў старажытных і пахаваных азёр і балот. І вось ужо 37 гадоў яна займаецца вывучэннем палеаклімату і расліннасці за 1 млн гадоў.

Яшчэ падчас навучання на геаграфічным факультэце яна стала салісткай ансамбля танца БДУ "Крыжачок", аб'ездзіла з калектывам усю Беларусь, СССР, была з канцэртамі ў Балгарыі і Германіі.

Галоўнай справай свайго жыцця Ядвіга Яловічава лічыць навуку, а пра сябе як педагога кажа — вельмі патрабавальная: "Патрабую пільнай увагі да навучальнага працэсу, высокага ўзроўню педагагічнай дзейнасці і актыўнай навуковай працы. Я ў свой час атрымала цудоўны шанец слухаць навуковыя даклады вучоных вядучых інстытутаў Расіі, Украіны, Літвы. Але адзначу, што менавіта дзякуючы беларускай школе паліналогіі, гэтая сфера геаграфічнай навукі займае цвёрдыя пазіцыі на прасторах Еўропы".

Ірына ШЫК

Ад рэдакцыі: інтэрв'ю з Ядвігай Казіміраўнай чытайце на сайце газеты "Універсітэт" — www.gazeta.bsu.by

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

НА ЛЕТА Ў ІНСТЫТУТ

Летні багаслоўскі інстытут будзе працаваць 26 чэрвеня — 8 ліпеня на базе дома адпачынку "Гарадок" пад Радашковічамі. Арганізатарамі яго выступілі Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ і Маскоўскі біблейска-багаслоўскі інстытут імя святога апостала Андрэя.

Слухачамі лекцый стануць першакурснікі і выпускнікі духоўных семінарый, акадэмій, багаслоўскіх і рэлігіязнаўчых факультэтаў, выкладчыкі рэлігійных дысцыплін і іншыя спецыялісты, якія жадаюць пашырыць і паглыбіць свае веды ў галіне багаслоўя. Дзве сесіі па 5 дзён выкладчыкі з Масквы і Санкт-Пецярбурга будуць чытаць курсы лекцый па біблеістыцы, багаслоўі, гісторыі Царквы, літургіцы, гісторыі хрысціянскага мастацтва, біблейскай археалогіі, гісторыі рэлігій, рэлігійнай філасофіі, богаслужэнні, біяэтыцы.

Летні багаслоўскі інстытут узнік 7 гадоў таму. Ён адкрыты не толькі для праваслаўных, але і для слухачоў іншых веравызнанняў. Католікі і пратэстанты ёсць і сярод выкладчыкаў.

КОНКУРСЫ

ДАЛУЧЫЛІСЯ ДА ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ

Узнагароджанне пераможцаў першага Рэспубліканскага конкурсу па гісторыі духоўнай культуры Беларусі сярод старэйшых школьнікаў і навучэнцаў ССНУ адбылося 9 чэрвеня ў Інстытуце тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы.

У конкурсе бралі ўдзел 70 навучэнцаў. Пераможцамі сталі Наталля Смольнікава, Яўген Фісенкін, Настасся Лявонкіна, Дар'я Малафеева, Таццяна Сяўко, Артур Васін, Наталля Бярэнчык, Віталь Сабалеўскі, Дар'я Чаркес. Дзевяцерых пераможцаў конкурсу павіншаваў рэктар інстытута Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Лаўрэатам уручылі кнігі і ганаровыя граматы. Для іх была наладжана экскурсія: Мінскае епархіяльнае ўпраўленне, Духоўная акадэмія, Жыровіцкі манастыр, праваслаўныя храмы Мінска.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

БДУ ў СМІ Беларусі

"Советская Белоруссия". Артыкул *"Креативный фольклор"* (06.06.2006) — пра фальклорна-этнаграфічны музей на філфаку БДУ.

"Настаўніцкая газета" ў артыкуле *"Навінкі маскоўскіх выдавецтваў у БДУ"* (25.05.2006) распавяла пра выставу вучэбнай літаратуры ў Белдзяржуніверсітэце; *"Конкурс паказаў, што ў рэгіёнах ёсць праблема з выкладчыкамі інфарматыкі"* (01.06.2006) — развагі пасля вочнага этапа V Рэспубліканскага вочна-завочнага конкурсу па матэматыцы і інфарматыцы для вучняў 8-11 класаў з сельскай мясцовасці, гарадоў раённага і абласнога падпарадкавання, які арганізуе Мінадукацыі і БДУ; *"У БДУ працягваецца стварэнне Інстытута Канфуцыя"* (06.06.2006); *"Першы конкурс па гісторыі духоўнай культуры правёў Інстытут тэалогіі"* (13.06.2006).

"Минский курьер". *"Студент и его дело № 1"* (26.05.2006) — гутарка са студэнтам 3-га курса Інстытута тэалогіі Міхаілам Міраненкам, адным з пераможцаў конкурсу сярод студэнтаў сталічных ВНУ на самы актыўны ўдзел у навуковым, грамадскім і культурным жыцці сталіцы; *"Мало того что умницы, так еще и красавицы"* (26.05.2006) — пра вынікі конкурсу прыгажосці, які прайшоў у Юрыдычным каледжы БДУ; *"Будущие журналисты не подкачали"* (27.05.2006) — пра перамогу дакументальнага фільма "Паэма веры", створанага студэнтамі журфака БДУ Андрэем Куцілам і Аляксандрам Налівайкам, на маладзёжным конкурсе відэафільмаў "Славянскае юнацтва: мары і надзеі" ў Маскве; *"Вот это голова!"* — пра кандыдата тэхнічных навук дацэнта БДУ Валерыя Супруна; *"Здесь каждое занятие начинается молитвой"* (01.06.2006) — гутарка з першым прарэктарам Інстытута тэалогіі айцом Серафімам; *"Сотрудничества много не бывает"* (07.06.2006) — пра падпісанне дамовы пра супрацоўніцтва паміж БДУ і Чанчуньскім інстытутам міжнароднай камерцыі.

"Знамя юности". *"Православные чтения в БГУ"* (26.05.2006); *"Математики в ударе"* (26.05.2006) — пра вынікі рэспубліканскай студэнцкай алімпіяды па матэматыцы, на якой студэнты БДУ ў першай катэгорыі занялі 1-е, 2-е і 3-е месцы;

"Народная газета". *"Ярмарка учебников"* (25.05.2006) — пра выставу вучэбнай літаратуры маскоўскіх выдавецтваў у БДУ; *"Каждому вузу — свой технопарк"* (08.06.2006) — гутарка з першым прарэктарам БДУ Сяргеем Рахманавым.

"Рэспубліка". *"Еще один шаг к единению"* (24.05.2006) — пра выставу вучэбнай літаратуры маскоўскіх выдавецтваў у БДУ; *"Медаль — лучшему изобретателю"* (30.05.2006) — пра атрыманне ўзнагароды "Лепшы вынаходнік Беларусі — 2006" кандыдатам тэхнічных навук дацэнтам БДУ Валерыем Супруном; *"Договор о сотрудничестве подписали Белорусский государственный университет и Чаньчуньский институт международной коммерции"* (08.06.2006).

"Звязда". *"Людзі ў першую чаргу глядзяць на тое, як яны жывуць..."* (01.06.2006) — гутарка з дырэктарам Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ Давідам Ротманам; *"Перамога журфака ў Маскве"* (02.06.2006) — пра перамогу дакументальнага фільма "Паэма веры" на маладзёжным конкурсе відэафільмаў "Славянскае юнацтва: мары і надзеі" ў Маскве; *"Беларускія сінтэтычныя алмазы — супраць натуральных"* (03.06.2006) — пра міжнародны навукова-практычны семінар, прысвечаны праблемам выкарыстання сінтэтычных алмазаў, арганізаваны падпрыемствам "Адамас БДУ"; *"Духоўная культура Беларусі — вачамі маладых людзей"* (09.06.2006).

"Дело". *"Бизнес — наука особая"* (№ 5, 2006) — гутарка з дырэктарам Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ Уладзімірам Апанасовічам з нагоды 10-годдзя інстытута.

"БелГазета". *"Как закалялась бизнес-элита..."* (29.05.2006) — матэрыял, прысвечаны 10-годдзю Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ.

"ЛіМ". *"Спачатку было слова"* (02.06.2006) — пра XII міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія навуковыя чытанні.

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, Белапан, ІНТЭРФАКС, АТН, тэлеканалы ЛАД, БТ, СТВ, АНТ, Беларускае радыё і FM-станцыі.

Агляд падрыхтаваны прэс-службай БДУ

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

В.В. Гричик. **Географическая изменчивость птиц Беларуси: таксономический анализ.** У манаграфіі даследуецца падвідавая прыналежнасць папуляцый гнездавых птушак Беларусі. Даецца анатаваны таксанамічны спіс 232 відаў.

Морфология вегетативных органов высших растений. У навучальным дапаможніку для студэнтаў хімічнага факультэта прыводзяцца звесткі па марфалогіі і анатоміі парастка, кораня, атожылка і ліста.

Н.А. Зайцева. **Чешский язык = Čeština.** Навучальны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі змяшчае мастацкія і грамадска-публіцыстычныя ілюстраваныя тэксты, часопісныя матэрыялы, якія спрыяюць разві-ццю маўлення. Разглядаюцца 16 размоўных тэм, кожнай спадарожнічае слоўнік-мінімум.

Ткани высших растений. Навучальны дапаможнік для студэнтаў хімічнага факультэта дае звесткі, неабходныя студэнтам для работы з мікраскапічнай тэхнікай. Таксама падаюцца адметныя характарыстыкі тканак раслін (утваральных, покрыўных, механічных і інш.).

Физика. Навучальна-метадычны дапаможнік для студэнтаў-завочнікаў біялагічнага факультэта змяшчае праграму па фізіцы, сціслы выклад матэрыялу, пытанні для самакантролю, прыклады рашэння задач і 5 варыянтаў кантрольных работ.

Л.В. Штефан. **Петрография метаморфических горных пород.** У курсе лекцый разглядаюцца асноўныя фактары і прычыны метамарфізму, даецца сістэматычнае апісанне горных парод і асвятляюцца пытанні іх паходжання.

Информационный бюллетень специального фонда Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренных учащихся и студентов. № 6. У інфармацыйны бюлетэнь увайшлі ўказы Прэзідэнта Беларусі, якія рэгламентуюць 10-гадовую дзейнасць фонду, рашэнні савета фонду, матэрыялы, якія асвятляюць дзейнасць па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў у СМІ.

Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ

"СКРЫПТОРЫЙ"-4 НА ФІЛФАКУ

У рамках Дзён філалагічнага факультэта адбылася прэзентацыя чацвёртага выпуска літаратурнага альманаха — "Скрыпторый".

У чацвёртым томе альманаха былі надрукаваны творы як ужо вядомых майстроў прыгожага пісьменства (Віка Трэнас, Валянціна Гарністава), так і тых, хто робіць першыя крокі (Раман Дубашынскі, Кацярына Зыкава, Андрэй Фаміцкі, Таццяна Мацюхіна, Ганна Міхальчук, Таццяна Мойса, Ксенія Навіцкая, Алена Плешкунова, Ларыса Пракоп'ева, Таццяна Пузенка, Ганна Серэхан, Артур Собаль, Марыя Табола, Яўген Філіповіч).

Падчас прэзентацыі быў праведзены майстар-клас, у якім прыняў удзел дарадца рэктара, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Уладзімір Навумовіч.

Рэдагаванне і выданне "Скрыпторыя" — клопат выкладчыкаў кафедры беларускай літаратуры і культуры (Л. Алейнік, П. Навуменка, У. Навумовіч, У. Рагойша, Л. Сінькова і інш.), якім мы мусім падзякаваць за выхаванне яшчэ аднаго "філалагічнага пакалення" паэтаў і празаікаў.

Сяргей ВАЖНІК,
намеснік дэкана філалагічнага факультэта

УНІВЕРСІТЭТ

15 чэрвеня 2006 года, № 12 (1942)

АБ'ЯВЫ

"ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ" БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

Лабараторыя аналітычных даследаванняў:

навуковы супрацоўнік (2 чалавекі);

Лабараторыя ядзернай оптыкі і касмафізікі:

навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

Лабараторыя фізікі хуткабежных працэсаў:

вядучы навуковы супрацоўнік (1 чалавек);

Лабараторыя ядзернай спектраскапіі:

навуковы супрацоўнік (1 чалавек).

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.

ПАДПІСКА — 2006

"ВЕСНІК БДУ"

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2006 года.

Падпісная цана на часопіс "Веснік БДУ" па серыях:

Серыя I — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень): індывідуальная (індэкс 74851) — 9 060 р.; ведамасная (індэкс 748512) — 27 439 р.

Серыя II — хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік): індывідуальная (індэкс 74852) — 9 060 р.; ведамасная (індэкс 748522) — 27 439 р.

Серыя III — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад): індывідуальная (індэкс 74853) — 18 130 р.; ведамасная (індэкс 748532) — 54 879 р.

Серыя IV — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань): індывідуальная (індэкс 74854) — 18 130 р.; ведамасная (індэкс 748542) — 54 879 р.

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

Часопіс "Веснік БДУ" ўсіх чатырох серый можна набыць у кіёску галоўнага корпуса БДУ (пр. Незалежнасці, 4) серый 3, 4 — у кіёску па вул. К. Маркса, 31(будынак гуманітарных факультэтаў БДУ), у кіёску "Універсітэцкая кніга" (вул. Ленінградская, 8).

Самы танны і надзейны спосаб атрымаць часопіс — гэта падпіска.

ЧАСОПІС ДЛЯ САЦЫЁЛАГАЎ

Навукова-тэарэтычны часопіс "Социология" — першае ў Рэспубліцы Беларусь перыядычнае выданне па пытаннях сацыялогіі. У ліку аўтараў часопіса вядучыя сацыёлагі Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краінаў СНД, а таксама ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Польшчы і інш.

Часопіс уключаны Прэзідыумам ВАК Беларусі ў лік выданняў для публікацыі матэрыялаў пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Часопіс разлічаны на чытачоў, якія спецыялізуюцца ў галіне сацыялогіі, а таксама сумежных галін навукі: выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў, спецыялістаў-практыкаў.

Перыядычнасць выхаду часопіса — 1 раз у квартал.

Цана падпіскі на навукова-тэарэтычны часопіс "Социология" на паўгоддзе складае:

для індывідуальных падпісчыкаў — 17.180 руб. (кошт аднаго нумара 8590 руб.). Падпісны індэкс — 74932;

для ведамаснай падпіскі — 52.878 руб. (кошт аднаго нумара 26.439 руб.). Падпісны індэкс — 749322.

Падпісацца на часопіс "Социология" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі РА "Белпошта" Рэспублікі Беларусь ("Каталог газет і часопісаў Рэспублікі Беларусь на другое паўгоддзе 2006 г.", с. 246).

Рэдакцыя часопіса

АФІЦЫЙНА

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ НА 2006 ГОД

з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасцях:

Механіка-матэматычны факультэт: матэматычны аналіз; дыферэнцыяльныя ўраўненні; геаметрыя і тапалогія*; матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лікаў; вылічальная матэматыка; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; механіка дэфармаванага цвёрдага цела;

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі: дыферэнцыяльныя ўраўненні*; тэорыя імавернасці і матэматычная статыстыка; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне ВМ і камп'ютарных сетак; тэарэтычныя асновы інфарматыкі; матэматычнае мадэляванне, лікавыя метады і комплексы праграм; метады і сістэмы абароны інфармацыі;

Фізічны факультэт: тэарэтычная фізіка; оптыка; фізіка кандэнсаванага стану; фізіка паўправаднікоў; лазерная фізіка; біяфізіка; прыборы і метады для вымярэння іанізуючых выпраменьванняў;

Факультэт радыёфізікі і электронікі: прыборы і метады эксперыментальнай фізікі; фізічная электроніка; фізіка плазмы; інфармацыйна-вымяральныя і кіруючыя сістэмы; сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі; элементы і прылады ВТ і сістэм кіравання; цвердацельная мікра- і нанаэлектроніка;

Хімічны факультэт: аналітычная хімія; арганічная хімія; фізічная хімія; высокамалекулярныя злучэнні; хімія высокіх энергій; хімія цвёрдага цела;

Біялагічны факультэт: біяхімія; батаніка; мікрабіялогія; заалогія; фізіялогія і біяхімія раслін; фізіялогія; генетыка; экалогія; гідрабіялогія; біятэхналогія;

Гістарычны факультэт: айчынная гісторыя; усеагульная гісторыя; гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання;

Факультэт міжнародных адносін: гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права, еўрапейскае права; палітычныя інстытуты, працэсы і тэхналогіі;

Эканамічны факультэт: эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай*; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі;

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук: анталогія і тэорыя пазнання; гісторыя філасофіі; сацыяльная філасофія; рэлігіязнаўства, філасофія культуры; агульная псіхалогія, псіхалогія асобы, гісторыя псіхалогіі; сацыяльная псіхалогія; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі; сацыялогія кіравання*;

Філалагічны факультэт: беларуская літаратура*; руская літаратура; літаратура народаў краін замежжа (з указаннем канкрэтнай літаратуры)*; тэорыя літаратуры, тэксталогія; беларуская мова; руская мова; тэорыя мовы;

Факультэт журналістыкі: журналістыка;

Юрыдычны факультэт: тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння; прыродарэсурснае права, аграрнае права, экалагічнае права; крымінальны працэс, крыміналістыка; адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права; тэорыя палітыкі, гісторыя і метадалогія палітычнай навукі; палітычныя інстытуты, працэсы і тэхналогіі*; палітычныя праблемы міжнародных адносін;

Геаграфічны факультэт: агульная і рэгіянальная геалогія; фізічная геаграфія і біягеаграфія; эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія;

Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі: агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі*;

Кафедра фізвыхавання: тэорыя і методыка фізічнага выхавання;

без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях:

Механіка-матэматычны факультэт: матэматычны аналіз*; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка;

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі: матэматычнае і праграмнае забеспячэнне ВМ і камп'ютарных сетак; тэарэтычныя асновы інфарматыкі;

Фізічны факультэт: оптыка*; фізіка атамнага ядра і элементарных часціц;

Факультэт радыёфізікі і электронікі: сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі;

Хімічны факультэт: фізічная хімія; хімія цвёрдага цела;

Біялагічны факультэт: біяхімія; фізіялогія і біяхімія раслін*; генетыка;

Гістарычны факультэт: айчынная гісторыя; усеагульная гісторыя*; гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання;

Факультэт міжнародных адносін: гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права*; міжнароднае права, еўрапейскае права; сусветная эканоміка;

Эканамічны факультэт: эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі;

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук: сацыяльная філасофія*; рэлігіязнаўства, філасофія культуры*; педагагічная псіхалогія; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі;

Філалагічны факультэт: руская мова;

Факультэт журналістыкі: журналістыка;

Юрыдычны факультэт: тэорыя і гісторыя права і дзяржавы*; канстытуцыйнае і муніцыпальнае права; прыродарэсурснае права, аграрнае права, экалагічнае права; крымінальнае права і крыміналогія, крымінальна-выканаўчае права*; крымінальны працэс, крыміналістыка*; адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права*;

Геаграфічны факультэт: фізічная геаграфія, біягеаграфія; эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія, геаэкалогія;

Кафедра фізвыхавання: тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры.

* - *мэтавая аспірантура*

У аспірантуру з адрывам і без адрыву ад вытворчасці прымаюцца асобы да 35 гадоў, якія маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі (за выключэннем дыплома бакалаўра) і (ці) дыплом магістра, схільнасць да навуковых даследаванняў, што пацвярджаецца навуковымі публікацыямі, удзелам у навукова-даследчых і інавацыйных праектах, навукова-практычных канферэнцыях, семінарах ці інш. матэрыяламі. Тыя, хто паступае, павінны мець вопыт практычнай работы не менш за два гады альбо рэкамендацыю вучонага савета ці факультэта ВНУ.

У аспірантуру па спецыяльнасцях педагагічнай галіны прымаюцца асобы, якія маюць стаж работы па спецыяльнасці ў сферы адукацыі не менш за 2 гады.

Асобы, якія раней прайшлі аспіранцкую падрыхтоўку ў межах вызначанага тэрміну ці поўны курс знаходжання ў якасці суіскальніка вучонай ступені, не маюць права паўторнага навучання ў аспірантуры за кошт бюджэтных сродкаў.

Тыя, хто паступае ў аспірантуру, здаюць уступныя экзамены па спецыяльнасці, замежнай мове і філасофіі ў аб'ёме дзеючых праграм для вышэйшых навучальных установаў. З праграмамі можна пазнаёміцца на адпаведных кафедрах. Уступны экзамен па спецыяльнасці папярэднічае экзаменам па іншых дысцыплінах. Пераздача ўступных экзаменаў не дапускаецца.

Ацэнка ведаў тых, хто паступае, ажыццяўляецца па пяцібальнай шкале.

Асобы, якія здалі цалкам ці часткова кандыдацкія экзамены згодна з вызначанымі патрабаваннямі, вызваляюцца ад адпаведных уступных экзаменаў і карыстаюцца пераважным правам залічэння ў аспірантуру па конкурсе. **Здача ўступнага экзамена па спецыяльнасці пры прыёме ў аспірантуру абавязковая.**

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць на імя рэктара універсітэта **заяву вызначанага ўзору** і дадаюць **наступныя дакументы:**

— асабісты лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфію і 2 фатаграфіі (фатаграфіі павінны быць наклеены на асабісты лісток па ўліку кадраў і на экзаменацыйны ліст);

— медыцынская даведка па форме, вызначанай Міністэрствам аховы здароўя для тых, хто паступае ў ВНУ;

— спіс і копіі апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў, патэнтаў і спіс справаздач пра выкананыя даследаванні і распрацоўкі; асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў і патэнтаў, прадстаўляюць навуковыя даклады (рэфераты) па выбранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю. Навуковыя работы ці рэферат рэцэнзуюцца меркаваным навуковым кіраўніком з выстаўленнем адзнакі на адваротным баку экзаменацыйнага ліста;

— копіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіскі з заліковай ведамасці;

— ксеракопію працоўнай кніжкі (для працуючых) ці рэкамендацыю савета факультэта ВНУ. У рэкамендацыі Вучонага савета факультэта ВНУ павінна ўказвацца тэма дыпломнай работы ці магістэрскай дысертацыі, а таксама адлюстроўвацца ўдзел рэкамендаванага ў навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, наяўнасць у яго публікацый (артыкулаў, дакладаў), патэнтаў на вынаходніцтвы, грантаў, імянных стыпендый;

— ксеракопію пашпарта (стар.1, 31, 32, 33);

— два канверты з зваротным адрасам (для іншагародніх);

— хуткасшывальнік (кардоны);

— копіі дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў (пры наяўнасці ў паступаючых у аспірантуру здадзеных кандыдацкіх экзаменаў).

Пашпарт, арыгіналы дыплома аб заканчэнні ВНУ і дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў прад'яўляюцца асабіста.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру па накіраваннях арганізацый, прадстаўляюць дадатковыя накіраванні арганізацый.

Прыём у аспірантуру з 1 ліпеня па 15 верасня 2006 года.

Уступныя экзамены праводзяцца з 25 верасня па 18 кастрычніка 2006 г.

Залічэнне ў аспірантуру з 1 лістапада.

Усім, хто паступае ў аспірантуру, перад першым уступным экзаменам па спецыяльнасці неабходна забраць у аддзеле аспірантуры экзаменацыйны ліст з пратаколам і пасля экзамена ў гэты ж дзень вярнуць іх у аддзел аспірантуры.

На наступныя экзамены (па замежнай мове і філасофіі) экзаменацыйныя лісты будуць накіроўвацца цэнтралізавана.

Усе, хто паступае ў аспірантуру, да 10 верасня павінны прайсці сумоўе з загадчыкамі кафедраў і меркаванымі навуковымі кіраўнікамі.

Асобам, дапушчаным да здачы ўступных экзаменаў у аспірантуру, паводле іх заявы наймальнік абавязаны прадаставіць адпачынак без захавання заработнай платы для падрыхтоўкі і здачы ўступных экзаменаў.

На падставе вынікаў уступных экзаменаў і з улікам наяўных вакантных месцаў на конкурснай аснове прыёмная камісія выносіць рашэнне па пытанні аб залічэнні ў аспірантуру асоб, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены.

Аспірантам, якія навучаюцца з адрывам ад вытворчасці, у вызначаным парадку выплачваецца стыпендыя.

Тэрмін навучання ў аспірантуры з адрывам ад вытворчасці — 3 гады, без адрыву ад вытворчасці — 4 гады.

Іншагароднім прадастаўляецца інтэрнат (без сям'і).

Выпускнікі магістратуры 2006 г. здаюць усе ўказаныя вышэй дакументы ў вызначаны тэрмін (да 10 верасня). Копіі дыплома магістра, дадатак да дыплома і рэкамендацыю савета факультэта ў аспірантуру пасля заканчэння магістратуры прадастаўляюць не пазней 1 кастрычніка гэтага года.

Дакументы накіроўваць на адрас: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, БДУ, аддзел аспірантуры, тэл. 209-54-23, 209-51-73.

Гэтыя ўмовы супрацоўнікі і студэнты БДУ могуць таксама атрымаць праз любую праграму, якая працуе з электроннай поштай (напрыклад, Microsoft Outlook). Для гэтага неабходна ў меню Від—Спіс папак адкрыць Агульныя папкі — Усе агульныя папкі — Галоўнае ўпраўленне навукі —Аддзел аспірантуры.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

15 чэрвеня 2006 года
Падпісана да друку 14.06.2006 г.
Зак. 552 . Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Валянціны КЛЯНІЦКАЙ
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by